Віталь Рыжкоў



...падаюць з неба радкі,

якія нельга сказаць...

# Нельга схавацца за словы...

## МЫ НЯ ПЕРШЫЯ

я кажу табе – мы ня першыя
пераблыталі фарбы ў палітрах
паралельныя лініі ў літарах –
у маіх паралельных вершах

апранаю кашулю адзіную –
непрыгожы нядзіўны усьмешлівы –
я кажу табе – гэтымі вершамі –
непрыгожымі і нядзіўнымі –

я кажу табе – па закрэсьленых
шпалах рэйкамі прабяжымся –
у апошніх нябрудных джынсах
неапошнімі бруднымі рэйсамі

мне нагадваеш ты з пагардаю –
ці то сьмешныя мы – ці то пешыя –
я кажу табе – мы ня першыя
мы ня першыя – мы упартыя.

* * *

*N*

да пабачэньня! – калі-небудзь яшчэ
пашанцуе сустрэцца
буду нешта тлумачыць п'яны ўшчэнт
па інерцыі

зачыняюцца вокны он-лайнавых гульняў
у сьпісах кантактаў
я цалую выявы смайлаў агульных
зацята

жыць у пошуку рыфмаў да словаў убогіх
па дарозе на працу
размаўляючы з (богам – закрэсьлена) блогам
як з апошняй інстанцыяй

## ВЯРТАЙСЯ

Вяртайся да мяне, вяртайся
ранішнім рэйсам, патаемна, –
адразу ў прайм-тайм, праз авіякасы,
праз неразуменьне, праз нервы.

Хадой, аўтаспынам, альбо бізнэс-класам,
але, калі ласка, вяртайся, вяртайся.
Адкінуўшы ўсё, не марнуючы часу, –
чакаю, чакаю, вяртайся, вяртайся.

Вяртайся да мяне, вяртайся –
ня мае сэнсу мая «медыцына» –
сюды, дзе фактычна адны пі…расы,
а я чакаю цябе традыцыйна.

Вяртайся да мяне, вяртайся
пакуль без прычыны, каб, можа быць, проста
па сьцежках блукаць уздоўж БелТрансГазу
і кпіць, і кахаць, і сьмяяцца, і помсьціць.

…Старое жыцьцё пад уключаным прасам
пакінь ненаўмысна; вяртайся, вяртайся…

Ня вернешся ты. Не вагайся. Прынамсі,
я буду чакаць: «Вяртайся, вяртайся...»

## БЕЗНАДЗЕЙНА АДЗІНОКІ ВЕРШ

*Ілбом грукаю ў сьцены –*
*замест дыялогу з ценем...*

Прынцыпова ўсё роўна, скончыцца дождж ці не –
тлумачу ілбом сьцяне, бо нікога навокал.
І нельга маю адзіноту прыкінуць на вока. Мне
так адзінока,

што маршрут у сем цыгарэт пралягае праз
бязьлюдную вуліцу і твой дом, дзе й вокны
ведаюць, што ты далёка; і таму як раз
так адзінока.

І нельга схавацца за словы, бо словы менш
за нярвовасьць... Умоўнымі знакамі
ценю тлумачу: нічога ня зьменіш.
Яму абыякава.

* * *

Невыносна па вуснах пляце павуціньне
адценьне пачуцьця – слухаю цені,
шукаю сузор'і ў тваім рабаціньні,
мы – цені таксама, мы – у адзеньні?..

Мы – у адзеньні, бо ведаем, дзе мы:
у якім атачэньні й аблогах якіх.
З засяроджаным тварам – чакаючы дзеі –
за дзьвярыма пакою прыціхлі бацькі.

## МАГДАЛІНА

Ня плач, Магдаліна, — улоньне Евангельля,
ты не сумуй, непахісная верніца,
вернецца твой гасподзь прагны –
па тэорыі імавернасьці –
абавязкова вернецца.

Паступова зацягнецца сэрца багнаю,
будзе балюча і крыўдна да скону –
і вернецца твой гасподзь прагны,
вернецца, вернецца абавязкова.

Чакаць у кнігарнях, кавярнях, метро,
на гэтым сьвеце чакаць (і тым)
і памятаць нават у ложку ўтрох,
што вернецца Божы сын.

Калісьці настане апошні год –
чаканьнем адно нічога ня зьменіш,
бо ты памрэш без прыходу Яго.
І ты першай Яго сустрэнеш.

## УЗМАХ КРЫЛАМІ

Я вачамі гляджу астылымі:
не пакідай
іржавець з паштовымі скрынямі!
І расстаньня не пераблытаю –
узмахнеш, адлятаючы, крыламі.

Я блукаю пакоямі брыдкімі,
канчаткова заблытаны крыўдамі.
Расстаемся.
У гэтым выпадку,
узмахнеш, адлятаючы, крыламі.

Ўсьлед кульгаю з тугой першабытнаю,
бо вяртаньне –
па вадзе віламі...
(Не займела ўзьдзеяньня прымаўка –
узмахнеш, адлятаючы, крыламі).

Ты мне вочы адкрыла, мілая! –
узмахнеш, адлятаючы, крыламі.

Я ўвесь посуд склею ды вымыю! –
узмахнеш, адлятаючы, крыламі.

Ты жадала бясьпекі ды выраю
і ня ведала, што рабіць
з крыламі...

Мілая, ў небе хапае пастак –
загінеш,
          парэзаная крыламі ластавак.
Адкуль ты ведаеш, – ляці, калі ласка! –
можа, яны і ня грэбуюць мясам.
Ты не баішся іх, ганарлівая,
Узмахнеш, пакідаючы, крыламі.

Апантана ўчапілася ў неба,
на разьвітаньне ўзмахнула, бачыце?
І мне да яе дацягнуцца – нельга.
Хоць і ўстаю
                на пальчыкі.

* * *

Я – не паэт. Я з дзяцінства не складаю вершы,
рыфмы – прынцыпова не прыдумваю;
мовай задушаны і на ёй жа падвешаны,
я хістаюся ветрам між такімі ж прыдуркамі...

Я карыстаюся неспрыяльнаю моваю
і, самае страшнае, выказваюся радкамі.
І, блазнаваты, чакаю моманту
і ні на што не наракаю...

* * *

*Павалу Гарбылёву*

Мы з табой, мы з табою таксама, таксама ня вечныя;
гэта – сум у вачох і штурханьні з боку у бок.
Мы блукаем, блукаем, блукаем дарогамі нечымі –
і ня знойдзем ніяк, і ня знойдзем пачаткі *сваіх* дарог.

* * *

Памятаеш, як віруючы паўпразрыстымі колерамі,
пераўтвараючы трапяткое паняцьце *жыцьцё* ў *сёньня,*
раскрываючыся выбухамі стракатага навакольля,
у небе нараджаліся й паміралі вясёлкі?
Ты толькі ўспомні, успомні, як пад дрыготкім небам,
блакіт якога не апісаць і ў радок ня ўціснуць,
нараджалася й памірала чырвоная й зялёная ганебнасьць
і белая, белая з чырваньню існасьць.

Успомні і захавай успамін, нібы фотаздымак,
што трымаюць пераважна з сабою побач,
бо рэчаіснасьць прымушае нас
дыхаць атручаным дымам,
што ўзносіцца з долу, пакідаючы попел і роспач.

**СЬНЕГ**

Сьнег над усёю зямлёю, сьнег...
У засяроджаным сэрцы — жах.
— Не
забівай
мяне! —
малюся на крыж нажа.

Сьнег над усёю зямлёю, у ім
магчыма сябе адшукаць.
На засяроджаным твары тваім —
*каінава пячаць*.

Сьнег над усёю зямлёю, сьнег...
Малюнак на шкле, імя.
— Не
забывай
мяне! —
далоні яе трымаў.

Сьнег над усёю зямлёю, які
працягвае думку ляза...
Падаюць з неба радкі,
якія нельга сказаць...